# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. ПЕКАЛІН)



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь): 613Д000583**

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Пекалін, на скрыжаванні вуліцы Леніна і вул. Чырвонай

**Каардынаты:** 53.905606, 28.122939

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Пекалін Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. Знаходзіца ў цэнтры вёскі. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна і дзяўчынкі. Пахавана 367 воінаў і партызан.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Пекалін Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000583**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Помнік знаходзіцца ў цэнтры вёскі. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік-скульптура воіна і дзяўчынкі, выкананая з металу (латунь, медзь). Уздоўж бетоннай дарожкі, якая вядзе да помніка, стаяць пліты з выбітымі імёнамі загінуўшых. У брацкай магіле пахавана 367 воінаў і партызан, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод пахаваных – воіны, якія загінулі ў ліпені 1944 года пры разгроме акружаных войскаў праціўніка ў мінскім "катле".

2 ліпеня 1944 г. – дзень вызвалення Смалявіччыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пачатая 23 чэрвеня 1944 г. аперацыя, вядомая пад кодавай назвай «Баграціён», вызначалася шырокамаштабным і імклівым наступленнем савецкіх войскаў. На першым яе этапе (23.06 – 04. 07. 1944 г.) была праведзена мінская аперацыя (29 чэрвеня – 4 ліпеня), у выніку якой і быў вызвалены Смалявіцкі раён.

У выніку Мінскай аперацыі ў лясах апынулася 105-тысячная групіроўка ворага. Паступова кальцо сціскалася і канчаткова разгром групіроўкі праходзіў у асноўным на тэрыторыі Смалявіцкага раёна, дакладней, яго паўднёвай частке. Цэнтрам мінскага «катла» стала в. Пекалін. Найбольш жорсткія баі праходзілі ў раёне в. Волма. Тут былі сканцэнтраваны галоўныя сілы гітлераўцаў, якія ішліляснымі дарогамі ў напрамку Студзенка – Пекалін – Волма, Пяцігодка – Волма.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

4. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.